*Голубева І. Р.,*

начальнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння інавацыйнага развіцця сферы культуры ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ДЗЕЙНАСЦІ КЛУБНЫХ УСТАНОЎ

Сучасныя тэндэнцыі развіцця сферы вольнага часу, асабліва культурна-адпачынкавай дзейнасці, выклікаюць неабходнасць пераарыентацыі некаторых відаў дзейнасці арганізацый культуры, адной з функцый якіх якраз і з'яўляецца стварэнне ўмоў для рэалізацыі насельніцтвам запатрабаванняў у сферы культуры і вольнага часу. Для больш эфектыўнай працы ў гэтым напрамку арганізацыям культуры трэба выкарыстоўваць новыя веды аб дынаміцы культурных працэсаў, попыце насельніцтва на культурныя паслугі, укараняць новыя сучасныя методыкі і тэхналогіі.

У сувязі з гэтым актуалізуецца праблема ўдасканалення навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці ўстаноў культуры. Сацыялагічнае даследаванне, праведзенае аўтарам у межах навукова-даследчай работы дзяржаўнай установы адукацыі «Інстытут культуры Беларусі» па тэме «Распрацаваць мадэль сеткі ўстаноў культуры клубнага тыпу і рэкамендацыі па ўдасканаленню метадычнай дзейнасці», ставіла на мэце даследаваць асаблівасці метадычнага забеспячэння дзейнасці клубных устаноў у сучасных умовах і выявіць наяўнасць супярэчнасцей, якія могуць існаваць у гэтай сферы. Вопыт даследаванняў па дадзенай праблематыцы [1], вынікі інтэрв'ю з кіраўнікамі абласных, раённых метадычных цэнтраў народнай творчасці (культурна-асветнай работы) і раённых дамоў (палацаў) культуры, што папярэднічалі даследаванню, прывялі да гіпотэз, у аснову якіх закладзена думка аб існаванні пэўных супярэчнасцей паміж:

1) запатрабаваннямі спецыялістаў клубных устаноў у метадычным забеспячэнні іх дзейнасці і магчымасцямі метадычных службаў у задавальненні гэтых запатрабаванняў;

2) уяўленнямі спецыялістаў клубных устаноў і спецыялістамі метадычных службаў адносна функцый і задач метадычнага забеспячэння на сучасным этапе развіцця сацыяльна-культурнай сферы;

3) зместам і структурай рэальнай метадычнай дзейнасці і стратэгічнымі задачамі метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Для вырашэння задач даследавання і верыфікацыі гіпотэз па спецыяльнай анкеце былі апытаны 400 кіраўнікоў і спецыялістаў клубных устаноў, што склала 4,0 % ад агульнай колькасці работнікаў, а таксама 140 кіраўнікоў і спецыялістаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абласных і раённых метадычных цэнтраў, спецыялістаў метадычных аддзелаў клубных устаноў з 37 раёнаў Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай і Мінскай абласцей.

У выбарцы прадстаўлены клубныя ўстановы з населеных пунктаў усіх тыпаў прапарцыянальна іх фактычнаму геаграфічнаму размяшчэнню і адлюстравана структура клубнай сеткі (74,5 % — клубныя ўстановы аграгарадкоў і населеных пунктаў сельскай мясцовасці).

Аналіз вынікаў даследавання паказаў, што ступень задаволенасці спецыялістаў клубных устаноў узроўнем і якасцю метадычнага забеспячэння іх дзейнасці залежыць у першую чаргу ад прафесійных функцый, якія яны выконваюць, і ад ступені забяспечанасці іх прафесійнай дзейнасці належнымі ўмовамі, у тым ліку навуковымі, метадычнымі, інфармацыйнымі матэрыяламі.

Па сведчаннях рэспандэнтаў, асноўнымі відамі дзейнасці, якімі яны займаюцца, з'яўляюцца наступныя (прапаноўвалася назваць не больш за 5 відаў дзейнасці):

1. Удзельнічаю ў падрыхтоўцы і правядзенні масавых мерапрыемстваў — 85,5 %
2. Кірую дзіцячай студыяй, гуртком — 60,0 %
3. Ажыццяўляю кіраўніцкія функцыі — 57,5 %
4. Падбіраю і вывучаю спецыяльную літаратуру — 53,5 %
5. Вывучаю культурныя запатрабаванні насельніцтва, попыт на паслугі клубнай установы — 51,0 %
6. Кірую калектывам мастацкай творчасці — 49,5 %
7. Арганізоўваю і праводжу выстаўкі, экскурсіі — 34,5 %
8. Вырашаю пытанні матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння дзейнасці клуба — 32,0 %
9. Забяспечваю сцэнарнымі і рэпертуарнымі матэрыяламі мастацкія калектывы — 26,5 %
10. Збіраю і фіксую ўзоры народнай культуры (фальклору, народнага мастацтва) у раёне, вобласці — 26,0 %
11. Распрацоўваю праграмы правядзення раённых свят, конкурсаў і інш. — 15,5 %

Па ацэнках рэспандэнтаў, для эфектыўнага выканання прафесійных абавязкаў дапамога спецыялістаў метадычных службаў ім патрэбна:

пастаянна — 46,5 %;

час ад часу — 50,5 %.

Толькі 2,0 % апытаных адзначылі, што не маюць патрэбы ў дапамозе метадыстаў.

Карэляцыйны аналіз даных паказаў, што існуе сувязь паміж такімі пераменнымі, як «патрэба ў метадычнай дапамозе» і «ўзровень адукацыі»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэспандэнтаў. Рэспандэнты з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у большай ступені адчуваюць патрэбу ў метадычным забеспячэнні іх дзейнасці, чым спецыялісты з вышэйшай адукацыяй у сферы культуры. Залежнасць ад працоўнага стажу ў дадзеным выпадку менш выразная. Пэўныя адрозненні фіксуюцца толькі ў групе рэспандэнтаў са стажам работы ў клубнай установе звыш 10 гадоў: удзельная вага тых, каму пастаянна патрэбна метадычная дапамога, у гэтай групе рэспандэнтаў ніжэйшая, чым у іншых.

Эфектыўнасць работы метадычных службаў ацэньваецца спецыялістамі клубных устаноў даволі высока: 89,0 % рэспандэнтаў ацанілі яе як эфектыўную, 4,0 % — як эфектыўную па некаторых напрамках, 0,5 % — як неэфектыўную; 6,0 % «клубнікаў» не змаглі даць ніякай ацэнкі (гл. мал. 1).




*Мал. 1.* Ацэнка спецыялістамі клубных устаноў эфектыўнасці работы метадычных службаў

З пункту гледжання мэты даследавання важным з'яўляецца высвятленне пытання адносна зместу і форм метадычнага забеспячэння, выяўленне найбольш актуальных напрамкаў узаемадзеяння метадычных службаў і клубных устаноў.

*Табліца 1*

Пытанні, па якіх спецыялісты клубных устаноў хацелі б атрымаць дапамогу ад метадычнай службы

| № п/п | Пытанне | Колькасць адказаўшых, % | | |
|---|---|---|---|---|
| | | так | магчыма | не |
| 1 | Арганізацыя абмену вопытам з калегамі з іншых устаноў культуры | 61,0 | 22,5 | 1,0 |
| 2 | Дапамога ў арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў | 53,0 | 28,0 | 6,5 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Працяг табл. 1*

| № п/п | Пытанне | Колькасць адказаўшых, % | | |
|---|---|---|---|---|
| | | так | магчыма | не |
| 3 | Новыя распрацоўкі, методыкі ў сферы маёй дзейнасці | 53,3 | 23,5 | 7,5 |
| 4 | Падбор і выкарыстанне сцэнарнай і рэпертуарнай літаратуры | 45,0 | 29,5 | 7,0 |
| 5 | Планаванне работы | 47,0 | 22,0 | 16,0 |
| 6 | Аналіз і рэкамендацыі па ўкараненню айчыннага і замежнага вопыту | 35,0 | 34,5 | 6,0 |
| 7 | Прымяненне інтэрактыўных форм работы з насельніцтвам | 34,5 | 36,0 | 10,0 |
| 8 | Пошук сродкаў (рэсурсаў, партнёраў) на рэалізацыю праектаў, праграм, мерапрыемстваў | 34,5 | 30,0 | 15,0 |
| 9 | Ацэнка якасці праведзенай работы | 34,0 | 25,5 | 17,0 |
| 10 | Арганізацыя клубнай работы | 27,5 | 33,0 | 19,0 |
| 11 | Распрацоўка сацыяльна-культурных праектаў | 30,0 | 32,5 | 18,0 |
| 12 | Аналіз сучасных культурных працэсаў у Беларусі, у пэўным рэгіёне | 20,5 | 35,5 | 22,0 |
| 13 | Укараненне сучасных тэхналогій | 36,5 | 19,5 | 14,0 |
| 14 | Пабудова партнёрскіх адносін з мясцовымі органамі ўлады | 30,0 | 27,0 | 19,0 |
| 15 | Пабудова партнёрскіх адносін з грамадскімі арганізацыямі | 25,0 | 31,5 | 19,0 |
| 16 | Вывучэнне і ўлік запытаў насельніцтва | 28,5 | 27,0 | 22,0 |
| 17 | Пабудова партнёрскіх адносін з прыватнымі арганізацыямі, бізнес-структурамі | 22,5 | 31,0 | 23,0 |
| 18 | Пабудова партнёрскіх адносін з арганізацыямі іншых сфер дзейнасці (адукацыі, аховы здароўя, МУС, царквы і інш.) | 30,0 | 25,5 | 22,0 |
| 19 | Падрыхтоўка і выданне аўтарскіх сцэнарных, рэпертуарных, метадычных матэрыялаў | 28,0 | 27,5 | 19,5 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заканчэнне табл. 1*

| №<br>п/п | Пытанне | Колькасць адказаўшых, % | | |
|---|---|---|---|---|
| | | так | магчыма | не |
| 20 | Улік мясцовых культурных традыцый у клубнай рабоце, арганізацыі вольнага часу насельніцтва | 16,0 | 23,0 | 7,0 |

*Табліца 2*

Пытанні, па якіх аказваецца метадычная дапамога ў дастатковай ступені

| №<br>п/п | Пытанне | Колькасць адказаўшых, % |
|---|---|---|
| 1 | Арганізацыя абмену вопытам з калегамі з іншых устаноў культуры | 53,0 |
| 2 | Дапамога ў арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў | 79,3 |
| 3 | Новыя распрацоўкі, методыкі ў сферы дзейнасці рэспандэнта | 36,6 |
| 4 | Падбор і выкарыстанне сцэнарнай і рэпертуарнай літаратуры | 65,9 |
| 5 | Планаванне работы | 70,0 |
| 6 | Аналіз і рэкамендацыі па ўкараненню айчыннага і замежнага вопыту | 14,6 |
| 7 | Прымяненне інтэрактыўных форм работы з насельніцтвам | 31,1 |
| 8 | Пошук сродкаў (рэсурсаў, партнёраў) на рэалізацыю праектаў, праграм, мерапрыемстваў | 26,2 |
| 9 | Ацэнка якасці праведзенай работы | 49,4 |
| 10 | Арганізацыя клубнай работы | 47,0 |
| 11 | Распрацоўка сацыяльна-культурных праектаў | 23,8 |
| 12 | Аналіз сучасных культурных працэсаў у Беларусі, пэўным рэгіёне | 22,0 |
| 13 | Укараненне сучасных тэхналогій | 12,2 |
| 14 | Пабудова партнёрскіх адносін з мясцовымі органамі ўлады | 24,4 |
| 15 | Пабудова партнёрскіх адносін з грамадскімі арганізацыямі | 18,3 |
| 16 | Вывучэнне і ўлік запытаў насельніцтва | 29,3 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заканчэнне табл. 2*

| № п/п | Пытанне | Колькасць адказаўшых, % |
|---|---|---|
| 17 | Пабудова партнёрскіх адносін з прыватнымі арганізацыямі, бізнес-структурамі | 10,4 |
| 18 | Пабудова партнёрскіх адносін з арганізацыямі іншых сфер дзейнасці (адукацыі, аховы здароўя, МУС, царквы і інш.) | 24,4 |
| 19 | Падрыхтоўка і выданне аўтарскіх сцэнарных, рэпертуарных, метадычных матэрыялаў | 34,8 |
| 20 | Улік мясцовых культурных традыцый у клубнай рабоце, арганізацыі вольнага часу насельніцтва | 24,4 |

Параўнальны аналіз даных, прыведзеных у табліцах 1 і 2, паказвае даволі высокую ступень супадзення чаканняў спецыялістаў клубных устаноў адносна дзейнасці метадычных службаў з фактычна ажыццяўляемай работай спецыялістаў-метадыстаў па такіх традыцыйных напрамках, як дапамога ў арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў, планаванне работы, падбор і выкарыстанне сцэнарнай і рэпертуарнай літаратуры, арганізацыя абмену вопытам з калегамі з іншых устаноў культуры, арганізацыя клубнай работы. У той жа час па такіх напрамках, як развіццё праектнай, пазабюджэтнай і інавацыйнай дзейнасці, пабудова партнёрскіх адносін з мясцовымі органамі ўлады, пабудова партнёрскіх адносін з грамадскімі арганізацыямі ажыццяўляецца ў недастатковай ступені. Мала ўвагі, па ацэнках «клубнікаў», надаецца такім пытанням, як укараненне сучасных тэхналогій, айчыннага і замежнага вопыту, пабудова партнёрскіх адносін з недзяржаўнымі арганізацыямі, бізнес-структурамі.

Нягледзячы на гэта, рэспандэнты як станоўчую ацанілі дынаміку ў дзейнасці метадычных службаў. На пытанне «Ці змяніліся ўзровень і якасць метадычнай работы за апошнія 2 гады?» адказы размеркаваліся наступным чынам:

так, стала лепш — 66,5 % рэспандэнтаў;

амаль не змяніліся — 21,5 %;

не магу ацаніць — 11,5 %;

нічога пра гэта не ведаю — 0,5 %.

Адмоўных адказаў на дадзенае пытанне не было.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольш запатрабаванымі з'яўляюцца:

– кансультацыі па канкрэтных пытаннях — 86,9 %;
– забеспячэнне метадычнымі рэкамендацыямі — 74,9 %;
– арганізацыя абмену вопытам — 59,8 %;
– забеспячэнне сцэнарнымі і рэпертуарнымі матэрыяламі — 56,3 %;
– сумеснае правядзенне мерапрыемстваў — 56,3 %.

Вызначаныя формы метадычнай дапамогі актуальныя для пераважнай большасці рэспандэнтаў, незалежна ад стажу работы рэспандэнта і тыпу ўстановы. Фіксуецца наяўнасць сувязі толькі паміж пераважнай формай метадычнай дапамогі і ўзроўнем адукацыі рэспандэнтаў. Для рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй у сферы культуры больш актуальныя кансультацыі метадыстаў па канкрэтных пытаннях (94,9 %) і менш актуальнае забеспячэнне сцэнарнымі і рэпертуарнымі матэрыяламі (33,3 %). Для рэспандэнтаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй аднолькава важныя ўсе формы. Але попыт на гатовыя сцэнарыі і рэпертуар выявілі больш як 60,0 % рэспандэнтаў гэтай катэгорыі.

Такім чынам, па выніках апытання можна зрабіць выснову, што, па ацэнках спецыялістаў клубных устаноў, абласныя і раённыя метадычныя цэнтры, метадычныя аддзелы (службы) ва ўстановах культуры за гады аптымізацыі сеткі і штатнай колькасці спецыялістаў (2013—2014 гг.) не толькі не згубілі сваіх пазіцый і значэння для клубных устаноў, але і ўмацавалі іх.

У цэлым, у пераважнай большасці рэспандэнты задаволены дзейнасцю метадычных службаў (гл. мал. 2).




*Мал. 2.* Ступень задаволенасці спецыялістаў клубных устаноў дзейнасцю метадычных службаў (%)

Паказальным з'яўляецца змястоўная ацэнка дзейнасці метадычных службаў і якасці метадычнага забеспячэння.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да *станоўчых прыкладаў* і напрамкаў дзейнасці «клубнікі» адносяць наступныя (у парадку змяншэння колькасці выказванняў):

праходзіць больш мерапрыемстваў, іх якасць павысілася;

павысіўся ўзровень падбору сцэнарных і рэпертуарных матэрыялаў, іншай літаратуры;

больш актыўна дапамагаюць у арганізацыі мерапрыемстваў;

з'явілася больш новых метадычных распрацовак, выдаецца больш метадычнай літаратуры;

часцей прапануюцца новыя методыкі;

больш увагі надаецца фальклору, мясцовым традыцыям;

метадысты часцей выязджаюць ва ўстановы культуры;

аказваецца дапамога ў планаванні работы;

актыўна выкарыстоўваецца інтэрнэт для абмену інфармацыяй і інш.

Сярод *недахопаў* адзначаецца наступнае:

рэдка прапануюцца новыя формы клубнай работы;

метадычная літаратура часта не ўлічвае спецыфіку канкрэтнай установы;

метадысты больш займаюцца інспектарскай, чым метадычнай дзейнасцю.

*Удасканаленне* дзейнасці метадычных службаў спецыялісты клубных устаноў звязваюць з наступным (у парадку змяншэння колькасці выказванняў):

арганізацыя большай колькасці мерапрыемстваў па абмену і распаўсюджванню перадавога вопыту ў сферы сацыяльна-культурнай дзейнасці;

удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы метадычных цэнтраў;

павелічэнне штатнай колькасці метадычных службаў;

выкарыстанне сучасных тэхналогій у сацыяльна-культурнай дзейнасці;

укараненне новых метадаў і форм работы з насельніцтвам;

наданне большай увагі фальклору, народным традыцыям і іх выкарыстанню ў мерапрыемствах;

павелічэнне колькасці свят на раённым узроўні;

наданне большай увагі рабоце па жанрах, правядзенню майстар-класаў;

большая практычная дапамога ўстановам культуры, улік спецыфікі кожнай установы, індывідуальны падыход;

аказанне дапамогі клубным работнікам у засваенні камп'ютарных праграм і інш.

У свядомасці большасці клубных работнікаў функцыі метадычнага забеспячэння дзейнасці клубных устаноў па-ранейшаму мала адрозніваюцца ад функцый саміх клубных устаноў, а яны павінны быць у першую чаргу звязаны з дапамогай клубам у арганізацыі культурных мерапрыемстваў і іншых форм работы.

Гэты вывад пацвярджаецца і вынікамі апытання работнікаў абласных, раённых метадычных цэнтраў, метадычных аддзелаў дамоў (цэнтраў) культуры.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Згодна з Палажэннем аб раённым (гарадскім) метадычным цэнтры народнай творчасці (культурна-асветнай работы), зацверджаным пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 2 лістапада 2004 г. № 21 (далей — Палажэнне аб метадычным цэнтры), *асноўнымі мэтамі і задачамі метадычных цэнтраў з'яўляюцца*:

павышэнне якаснага ўзроўню метадычнага абслугоўвання клубаў, палацаў (дамоў, цэнтраў) культуры, цэнтраў (дамоў) народнай творчасці (народнага мастацтва, фальклору), цэнтраў (дамоў) рамёстваў, маладзёжных культурных цэнтраў, цэнтраў нацыянальных культур і іншых клубных устаноў (далей — клубныя ўстановы) шляхам распрацоўкі канцэпцый і праграм захавання і развіцця культуры, народнай творчасці ў сваім рэгіёне;

удасканаленне зместу арганізацыі вольнага часу, павышэнне яго сацыяльнай значнасці, пошук і ўкараненне новых, эфектыўных форм і метадаў работы з насельніцтвам;

вывучэнне і аналіз стану дзейнасці клубных устаноў па развіццю новых форм клубнай работы, а таксама народнай і мастацкай творчасці (непрафесійныя / аматарскія калектывы, народныя майстры);

вывучэнне і ўкараненне ў практыку клубных устаноў перадавога вопыту работы айчынных і замежных устаноў культуры;

удзел у арганізацыі і правядзенні культурных мерапрыемстваў, накіраваных на распаўсюджванне і папулярызацыю культурных каштоўнасцей (аглядаў, конкурсаў, фестываляў, свят, выставак, выступленняў непрафесійных / аматарскіх калектываў мастацкай творчасці, кірмашоў і інш.);

распрацоўка сцэнарна-метадычных і рэпертуарных матэрыялаў па ўсіх жанрах народнай творчасці;

фарміраванне даведачна-інфармацыйнага фонду метадычных матэрыялаў, сцэнарных распрацовак клубных устаноў;

павышэнне прафесійнага ўзроўню, майстэрства кадраў клубных устаноў;

ажыццяўленне міжнароднага культурнага супрацоўніцтва з мэтай далучэння грамадзян, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, да каштоўнасцей сусветнай культуры і інтэграцыі беларускай нацыянальнай культуры ў сусветную культуру і сусветную інфармацыйную прастору;

садзейнічанне ўкараненню перадавых інфармацыйных тэхналогій у дзейнасць арганізацый культуры [3].

Разгледзім асноўныя віды дзейнасці, якія метадысты, па іх уласнаму меркаванню, ажыццяўляюць пастаянна, і вызначым, наколькі яны адпавядаюць тым функцыям, што вызначаны нарматыўнымі дакументамі, у прыватнасці Палажэннем аб метадычным цэнтры. У ранжыраваным выглядзе асноўныя віды дзейнасці прадстаўлены ў табліцы 3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 3*

Асноўныя віды дзейнасці метадыстаў метадычных службаў

| № п/п | Від дзейнасці | Колькасць апытаных, % |
|---|---|---|
| 1 | Удзельнічаю ў падрыхтоўцы і правядзенні масавых мерапрыемстваў | 77,1 |
| 2 | Арганізую і праводжу прафесійную вучобу работнікаў клубных устаноў (семінары, творчыя лабараторыі, круглыя сталы і г.д.) па пытаннях народнай творчасці і культурнай дзейнасці ў вольны час | 56,8 |
| 3 | Забяспечваю сцэнарнымі і рэпертуарнымі матэрыяламі клубныя ўстановы, мастацкія калектывы | 55,1 |
| 4 | Аналізую статыстычныя даныя аб рабоце клубных устаноў свайго раёна (горада) | 55,1 |
| 5 | Распрацоўваю праграмы правядзення раённых свят, конкурсаў | 44,9 |
| 6 | Вяду пошук і прапаганду новых, больш эфектыўных форм і метадаў работы клубных устаноў | 44,1 |
| 7 | Вывучаю практыку, выяўляю тэндэнцыі і распрацоўваю рэкамендацыі па клубнай рабоце і развіццю народнай творчасці | 36,4 |
| 8 | Вывучаю культурныя запатрабаванні насельніцтва, попыт на паслугі клубнай установы | 21,2 |
| 9 | Збіраю і фіксую ўзоры народнай культуры (фальклору, народнага мастацтва) у раёне, вобласці | 20,3 |
| 10 | Распрацоўваю канцэпцыі і праграмы развіцця культуры, народнай творчасці ў сваім рэгіёне | 16,1 |
| 11 | Фарміруючую заяўкі на сацыяльна-творчыя заказы | 11,9 |
| 12 | Падбіраю і вывучаю спецыяльную літаратуру па пэўнаму напрамку дзейнасці | 10,5 |
| 13 | Ажыццяўляю кіраўніцкія функцыі (планаванне, фінансавае забеспячэнне, кантроль і г.д.) | 3,9 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, па самаацэнках метадыстаў, іх асноўны від дзейнасці — удзел у падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў, якія цалкам супадаюць з асноўным відам дзейнасці клубнага работніка.

Тым не менш задаволены дзейнасцю сваіх метадычных службаў 86,4 % рэспандэнтаў-метадыстаў, 87,3 % рэспандэнтаў лічаць яе эфектыўнай.

За апошнія два гады 49,2 % апытаных адзначылі павышэнне ўзроўню і якасці метадычнай дзейнасці. Гэта лічба значна меншая, чым па выбарцы «клубныя работнікі» (66,5 %), але з улікам колькасці тых, хто сцвярджае, што стала не горш («амаль не змянілася» — 24,6 %), можна казаць пра даволі высокую ацэнку дынамікі развіцця метадычнай дзейнасці з пункту гледжання работнікаў метадычных службаў.

Паказальна, што ніякай ацэнкі не змаглі даць 22,0 % метадыстаў.




*Мал. 3.* Ацэнка дынамікі развіцця метадычнай дзейнасці:
а) метадыстамі; б) спецыялістамі клубных устаноў (%)

Што, на думку рэспандэнтаў, палепшылася ў дзейнасці метадычных службаў? У першую чаргу «павысіўся узровень мерапрыемстваў». Адзначаюцца таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

больш высокі ўзровень рэкамендацый, выкарыстанне сучасных методык, укараненне новых форм работы. На жаль, у межах дадзенага апытання нельга вызначыць, што канкрэтна стаіць за гэтымі выказваннямі. Прыметай павышэння ўзроўню метадычнай дзейнасці рэспандэнты лічаць «пашырэнне кола спецыялістаў, якія звяртаюцца да іх за дапамогай».

У якасці негатыўных момантаў называюцца наступныя:

– у сувязі з аптымізацыяй нагрузкі стала больш, а спецыялістаў — менш;
– мала часу на непасрэдна метадычную работу;
– не хапае спецыялістаў па жанрах, асабліва па фальклору;
– не хапае спецыялістаў з профільнай адукацыяй;
– бягучасць кадраў;
– шмат «папяровай» працы, справаздачнасці.

З пункту гледжання рэспандэнтаў, удасканаленне работы метадычных цэнтраў знаходзіцца ў большай ступені ў арганізацыйна-кіраўніцкай плоскасці: паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы цэнтраў, а таксама кадравага складу (патрабуюцца спецыялісты з профільнай адукацыяй у сферы культуры, спецыялісты па жанрах); лепшая арганізацыя працы са зніжэннем затрат на няпрофільныя віды дзейнасці.

Пэўная частка рэспандэнтаў выказалася за неабходнасць правядзення большай колькасці міжабласных семінараў па абмену вопытам, практычных заняткаў па засваенню камп'ютарных праграм, выдання большай колькасці рэпертуарных зборнікаў.

Неабходнасць удасканалення метадычнага забеспячэння дзейнасці клубных устаноў актуалізавалася, перш за ўсё, у сувязі з пастаўленымі дзяржаўнымі задачамі па павышэнню ролі нацыянальнай культуры ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, забеспячэнню доступу грамадзян да культурных даброт і ўдзелу ў культурным жыцці. Таму, на думку некаторых расійскіх даследчыкаў, місія метадычнага забеспячэння можа разглядацца больш шырока і павінна быць звязана з абгрунтаваннем мер па захаванню і развіццю этнакультурнай разнастайнасці, даступнасці і ўдзелу грамадзян у культурным жыцці, па выкарыстанню «культурнага капіталу» для эканамічнага і сацыяльнага развіцця, стварэнню эфектыўных механізмаў кіравання культурнымі рэсурсамі рэгіёнаў. Такім чынам, прызначэнне методыкі ў сферы культуры заключаецца ў фарміраванні спосабаў і метадаў не толькі стварэння культурнага прадукту (канцэртаў, свят і г.д.), але і далучэння большай колькасці насельніцтва да культурнай дзейнасці і спажывання паслуг культуры. Задача метадыста — знайсці спосаб, метад далучэння насельніцтва да культурнага працэсу, прадаставіць умовы для дасягнення максімальнага эфекту ад паслугі, а не ствараць творы. Для гэтага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метадычная работа павінна быць накіраваная на бесперапынны рост прафесіяналізму і кваліфікацыі кіраўнікоў, спецыялістаў устаноў культуры, развіццё іх творчага патэнцыялу, эрудыцыі і кампетэнтнасці. Канчатковая мэта метадычных службаў — забеспячэнне ўстаноў культуры сучаснымі методыкамі, з тым каб узровень іх работы адпавядаў патрэбам грамадства і кожнага чалавека паасобку [2].

У рэальнасці, як паказала даследаванне, многія задачы і віды дзейнасці, якія павінен ажыццяўляць матадычны цэнтр, цесна пераплецены з задачамі і відамі дзейнасці клубных устаноў нават на арганізацыйным узроўні. На практыцы такое перапляценне, нявызначанасць спецыфікі менавіта метадычнай дзейнасці праяўляюцца ў змесце і структуры метадычнага забеспячэння клубаў, дзе заўважаны ўхіл у бок сумеснага правядзення культурных мерапрыемстваў. З другога боку, магчыма, гэтым можна патлумачыць высокую ступень задаволенасці спецыялістаў клубных устаноў зместам і якасцю метадычнага забеспячэння.

Існуючая сёння ў Беларусі сістэма паказчыкаў дзейнасці арганізацый культуры прымушае развіваць такія напрамкі і формы работы, якія прадугледжаны галіновай статыстыкай для розных тыпаў устаноў. Для клубных устаноў гэта, у першую чаргу, «колькасць мерапрыемстваў» і «колькасць клубных фарміраванняў». Таму зразумела, што ў росце колькасных значэнняў у дадзеным выпадку зацікаўленыя і «клубнікі», і метадысты. Аднак толькі па гэтых паказчыках цяжка вызначыць эфектыўнасць і сацыяльную значнасць дзейнасці клубных устаноў і метадычных службаў.

Такім чынам, гіпотэза даследавання аб наяўнасці супярэчнасці паміж запатрабаваннямі спецыялістаў клубных устаноў у метадычным забеспячэнні іх дзейнасці і магчымасцямі метадычных службаў у задавальненні гэтых запатрабаванняў, а таксама гіпотэза аб наяўнасці супярэчнасці паміж уяўленнямі спецыялістаў клубных устаноў і спецыялістамі метадычных службаў адносна функцый і задач метадычнага забеспячэння не знайшлі свайго пацвярджэння.

У пэўнай ступені пацвердзілася гіпотэза адносна таго, што змест і структура метадычнай дзейнасці не ў поўнай меры адпавядае стратэгічным задачам метадычнай дзейнасці на сучасным этапе развіцця сацыяльна-культурнай сферы.

Удасканаленне метадычнай дзейнасці (у кантэксце вынікаў даследавання) можа развівацца ў напрамку выраўноўвання функцый метадычных службаў у бок аналітычна-даследчай работы ў галіне культуры (у адпаведнасці з Палажэннем аб метадычным цэнтры), пошуку і ўкаранення новых, эфектыўных форм і метадаў работы з насельніцтвам і г.д. Гэта ў найбольшай ступені адпавядае сучасным тэндэнцыям развіцця сферы культуры.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Голубева, І. Р. Узаемадзеянне абласных і раённых метадычных цэнтраў як умова ўдасканалення інфармацыйна-метадычнага забеспячэння галіны культуры (сацыялагічны аспект) / І. Р. Голубева // Веснік Беларус. дзярж. ін-та праблем культуры. — 2003. — № 3. — С. 27—30.

2. Методическое обеспечение социально-культурной деятельности [Электронный ресурс] : учеб.-метод. пособие. — М., 2008. — Режим доступа : http://pandia.ru/text/77/167/14326.php. — Дата доступа : 20.11.2015.

3. Палажэнне аб раённым (гарадскім) метадычным цэнтры народнай творчасці (культурна-асветнай работы) : пастанова Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, 2 ліст. 2004 г., № 21 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. — 2004. — № 8/11696.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ